1. Якія мары выказаны ў гэтай песні?
2. Што можна сказаць пра чалавека, які жыве такімі надзеямі?
3. Якія ласкавыя словы ўжываюцца ў вясновай песні? Знайдзіце і прачытайце іх.
4. Разгледзьце ілюстрацыю да песні. Якія прыкметы сведчаць пра раннюю вясну? Назавіце іх.
5. З якой інтанацыяй варта чытаць словы гэтай песні? Чаму? Як вядома, вяснянкі ў большасці выконваліся наступным чынам: адзін удзельнік гурту спяваў першыя два радкі, а трэці і чацвёрты радкі спевакі выконвалі хорам. Выразна прачытайце і вы гэту песню так.

**Давайце абмяркуем.** Ці даводзілася вам бываць у вясеннім лесе? Раскажыце, што цікавага вы бачылі ў ім.

***Пе́кны*** — прыгожы.
***Каламу́тны*** — му́тны, непразрысты.
***Ціку́е*** — тут: цячэ ў выбраным напрамку.
***Хляве́ц*** — памяшканне для свойскай жывёлы, птушак.
***Паро́г*** — тут: перашкода, якая затрымлівае ход вады.
***Перава́л*** — тут: найбольш нізкае месца на полі, даступнае для пераходу вады.
***Мардава́цца*** — выбівацца з сіл.
***Пакрысе́*** — паступова, не адразу.



Правообладатель Национальный институт образования

## Вясна

Які пекны, слаўны дзянёк! Выйдзем, дзеткі, на вуліцу, на божы свет. Паглядзім, паслухаем. Можа, чаго і навучыць нас гэты божы свет?

Пачарнеў на полі снег, а на ўзгорках сталі паказвацца чорныя лапінкі, лысіны. Па вуліцах пацяклі равочкі каламутнай вады. Весела бягуць яны разоркаю з поля праз двор, блішчаць і срэбрам пераліваюцца на сонейку. Цякуць яны і ўсё большаюць. Выходзіць з хаты гаспадар. Бачыць: вада цікуе на яго хлявец. Не, галубка! Не чапай будовы. Там стаіць авечачка, кароўка. Ідзі сабе далей. І гаспадар бярэ рыдлёўку і пракопвае ёй дарогу. А воданька закаламу́ціцца яшчэ больш і пабяжыць далей. Па дарозе сустракае яна другі гэтакі самы равок. Сустрэнуцца, забулькаюць нешта вясёленькае адзін аднаму, сальюцца і пабягуць далей разам. Іх сустрэне зноў новы равок, а там, пазіраеш, прыстане і чацвёрты, і пяты. І ўсе яны зліваюцца: разам і весялей, і лягчэй ваяваць з тымі парогамі, якія загараджаюць ім дарогу. І нікога яны не крыўдзяць. Сустрэнуць малюсенькі равочак, такі малюсенькі, што цячэ ён, як слёзка, па капельцы. Мардýецца, бедны, працуе над кусочкам лёду, што загарадзіў яму сцежачку. Збірае ўсе сілы і з вялікім трудом ледзьве-ледзьве скоціць нягодны



Правообладатель Национальный институт образования



кусочак лёду і з такою гэта радасцю зліваецца з пераналам! А перавал ахвотней бярэ з сабою і яго працу. І вось пакрысе́, памаленьку перавал пераходзіць ужо ў рэчку. Шуміць, раве ў полі. Ён так ужо акрэп, што можа пакаціць і камень.

Бачыце, дзеткі, як расце сіла вады.

*Паводле Якуба Коласа.*

1. Якую веснавую з’яву прыроды апісвае Якуб Колас у творы?
2. З якой мэтай пісьменнік ужывае ў творы ласкавыя словы? Знайдзіце і прачытайце іх.
3. З дапамогай якіх слоў і выразаў аўтар ажыўляе вясну? Прачытайце іх.
4. Чаму Якуб Колас запрашае дзяцей паглядзець, як вада набірае сілу? На што скіроўвае ён увагу малога чытача?



Правообладатель Национальный институт образования

5. Якая асноўная думка гэтага апавядання?
6. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Віктара Каралёва «Вясна прыйшла». Якія радкі з апавядання Якуба Коласа найбольш сугучныя з гэтым творам жывапісу? Прачытайце.



7. Падрыхтуйце выразнае чытанне апавядання.

**Давайце абмяркуем.** Ці даводзілася вам назіраць за вясновымі з'явамі? Што цікавага і незвычайнага вы назіралі? Раскажыце.

## Загадка

Без ног бяжыць, без вачэй глядзіць.



Правообладатель Национальный институт образования